Данута Ващукувна-Каменецка отмечает, что в ночь с 23 на 24 июня (дата празднования Ивана Купалы у католиков, связанная с днём рождения в этот день Ивана Предтечи) ворота крепости были открыты для всех горожан. Оба берега реки Буг и мост, соединяющий Цитадель с Тереспольским укреплением, были украшены флажками и разноцветными лампочками, густо развешанными на верёвках, протянутых через реку. Построен был также «Весёлый городок» с различными аттракционами: карусели, тоннели под водой, танцевальные площадки. В программу были включены различные игры и конкурсы, катание на лодках, гонки в бочках и лоханках. Каждое подразделение готовило макет сказочного или исторического события, факта или героя. Особый восторг детей и бурные аплодисменты публики вызывал парад превращённых в сказочные суда лодок в виде драконов, китов, цветов лотоса с прекрасной нимфой внутри, и многих других жанровых картинок. Когда сгущались сумерки, с платформы пристани спускались на воду венки, украшенные цветами и свечками. После того, как уплывали венки, начинался «Морской Бой» и захват построенного на другом берегу реки макета морской крепости, которую атаковали военные корабли, сооружённые на нескольких понтонах. В конечном результате морская крепость была захвачена. Праздник длился до поздней ночи. Молодёжь веселились всю ночь, танцуя под музыку нескольких оркестров, завершался праздник фейерверком [1, с. 73].

Современные жители Бреста стремятся сохранить традицию празднования Ивана Купалы. В 2016 г. промо группа «Зала чакання», деятельность которой направлена на развитие культурного климата в городе, организовала «Купальскі фэст». Целью этого мероприятия, по задумке организаторов, было ознакомление участников с традиционными купальскими обрядами. В рамках «Купальскага фэсту» были проведены мастер-классы по плетению купальских венков, изготовлению кукол-оберегов и росписи льняных сумок. Лидеры Студенческого Этнографического Общества знакомили участников с традиционными белорусскими играми и купальскими песнями. Для детей были устроены водный бой и квест «Пошук папараць-кветкі» [7]. В 2017 г. промо группа «Зал чакання» также планирует провести «Купальскі фэст», и, возможно, это мероприятие станет для Бреста традиционным.

Обряд «Венки», который проводился в рамках праздника Ивана Купалы жителями города Бреста по инициативе польского гарнизона, представляет собой яркий пример взаимодействия польской и белорусской культур на территории Бреста и имеет значительную ценность для изучения художественной культуры города в аспекте межкультурной коммуникации. Традиция празднования Ивана Купалы, обогатившая культурную жизнь Бреста начала XX в., актуальна и сегодня, она возрождается в городе благодаря инициативе молодёжных творческих объединений.

**Список литературы:**

1. Ващукувна-Каменецка, Д. Брест – город незабываемый. – Брест, Альтернатива, 2000. – 284 с.
2. Памяць : Гіст.-дакум. хроніка Брэста. У 2 кн. Кн. 1. – Мінск : БЕЛТА, 1997. – 576 с.
3. Суворов, А. Брестская крепость на ветрах истории / А. Суворов. – Брест : Редакция журнала СЭЗ, 2004. – 152 с.: ил.
4. Сченснович, К. В. История фортепианного отделения Брестского музыкального колледжа / К. В. Сченснович. – Брест : Альтернатива, 2010 – 45 с.
5. Сысоў, У. З крыніц спрадвечных / У. Сысоў. – Мінск : Вышэйшая школа, 1997. – 415 с.
6. Этнаграфія Беларусі: энцыкл. / рэдкал. : І. П. Шамякін (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 575 с.
7. Архив статей по истории и культуре города Бреста [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.brestcity.com. – Дата доступа: 30.03.2017.

*Дана Струнеўская*

**ТРАДЫЦЫЯ КАЛЯДНЫХ КАРАГОДАЎ МАГІЛЁЎШЧЫНЫ**
***(паводле экспедыцый студэнтаў БДУКМ у в. Любонічы Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці)***

*Dana Struneuskaya*

***THE TRADITION OF THE CHRISTMAS ROUND DANCES MAHILIOU REGION***
***(according to the expeditions of BSUCA students in the village of Lyubonichi, Kirau district)***

*У артыкуле апісваецца карагодная традыцыя Магілёўскага Падняпроўя, а таксама аналізуюцца калядныя карагоды «Дуба», «Касары», «Баяры», «Цыганачка», запісаныя ў в. Любонічы Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці.*

*The article describes the round dance tradition of Mahiliou Padniaproue, also analyzes the Christmas round dances «Duba», «Kasary», «Bayary», «Tsyganachka» recorded in the village of Lyubonichi, Kirau district, Mahiliou region.*

Рэгіёны Беларусі поўняцца разнастайнымі традыцыямі і абрадамі. І кожны рэгіён мае свае каштоўнасці, вылучацца асаблівасцямі, па якіх з упэўненасцю можна сказаць, што тая ці іншая традыцыя характэрна і распаўсюджанна на пэўнай тэрыторыі.

Магілёўшчына – адзін з найбольш самабытных з пункту гледжання народнай харэаграфіі рэгіён. І традыцыйнай асаблівасцю гэтага рэгіёна з'яўляецца карагоднасць. Беларускія даследчыкі склалі паглыбленае ўяўленне аб такой з'яве беларускай традыцыйнай культуры, як карагод.

У традыцыі Магілёўшчыны карагод прадстаўляецца складанай з'явай, якая арганічна ўключана ў каляндарную сістэму. Карагоды падзяляюцца на некалькі груп, якія ў сваю чаргу вылучаюцца па пэўных крытэрыях. Кожная група ахоплівае пэўную тэрыторыю Магілёўшчыны. Так, карагоды на Магілёўскім Падняпроўі падзяляюцца на дзве асноўныя групы: вясенне-летнія і зімовай прымеркаванасці. Але вылучаюцца яшчэ некалькі груп па функцыянальнасці карагодаў: абрадавыя, прымеркаваныя да абраднасці, а таксама карагоды, якія выконваліся ў любы час.

Карагод як пэўная з'ява ў харэаграфіі мае свае характарысткі выканання. У характарыстыку выканання ўваходзіць наступная форма вызначэння: хто можа ўдзельнічаць у карагодзе, колькі чалавек, малюнак руху. Самыя распаўсюджаныя карагоды класічныя. Па сведках носьбітаў карагод – выключна жаночая традыцыя, а мужчыны ў іх ніколі ўдзелу не прымалі. Характар выканання класічных карагодаў звычайна спакойны, павольны. Удзельніцы трымаюць адзін аднаго за рукі ўнізе і рухаюцца павольным рытмічным крокам. Малюнак класічных карагода мае нескладаную форму кола (мал.1), шарэнгі (мал.2), змейкі (мал.3). Падчас ваджэння карагоду ў яго маглі далучацца новыя ўдзельнікі, а калі іх набіралася

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шмат, агульнае кола дзялілася на 2-3 самастойныя карагоды. Па сведках носьбітаў, карагод заўсёды вадзіўся па сонцы, але з цягам часу пра гэта правіла сталі забываць. Зараз у сучаснай практыцы распаўсюджаны рух і па сонцы, і супраць яго. Класічныя карагоды разнастайныя па сваім тэкставым змесце і мелодыях. Далей мы паказваем схематычныя малюнкі, на якіх кружкі – удзельнікі карагода.

Табліца 1 – Абрадавая карта 4 калядных карагодаў в. Любонічы

| *Акцыянальны код* | *Тэмпаральны код* | *Лакатыўны код* | *Персанальны код* | *Музычна-вербальны код* | *Музычна-інструментальны код* | *Пластычны код* |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Калядны карагод «Луба» | Выконваўся падчас калядных святкаванняў. Па старым стылі з 24 снежня па 7 студзеня, па новым з 7 студзеня па 19 студзеня. | У хаце, на вуліцы | Дзяўчаты | 1.Як я была мала, калэхала мяне мама,<br>Ой, д(**о**)ба, д(**о**)ба, д(**о**)ба, дз(**е**)ўчына мая л(**ё**)ба,<br>Дз(**е**)ўчына мая л(**ё**)ба, палюбіла сабе др(**о**)га,<br>Ой, дык дуба-дуба, ой, дык дуба-дуба<br>Ой, дык дуба-дуба, ой, дык дуба-дуба<br><br>Поўны тэкст знаходзіцца ў архіве кафедры этналогіі і фальклору. | a-capella | Удзельніцы трымаюцца за рукі, адна дзяўчына стаіць у цэнтры кола. Карагод на першым куплеце рухаецца ў адзін бок, а на рэфрэне дзяўчына мяняецца месцамі з іншай удзельніцай карагода. На другім куплеце карагод рухаецца ў іншы бок. Так паўтараецца да канца песні. Рух- траісты крок. |
| Калядны карагод «Касары» | Выконваўся падчас калядных святкаванняў. Па старым стылі з 24 снежня па 7 студзеня, па новым з 7 студзеня па 19 студзеня | У хаце, на вуліцы | Дзяўчаты | 1.А пад мастом рыба с хвастом,<br>Вадзіца не ле**(я)**,<br>Гэй, гэй касар(**э**), вы касар(**э**)кі мае.<br><br>Гэй, гэй касар(**э**), вы касар(**э**)кі мае.<br><br>Поўны тэкст знаходзіцца ў архіве кафедры этналогіі і фальклору. | a-capella | Карагод складаецца з дзвюх шарэнгаў, якія ўтвараюць дзве паралельныя рысы На першы куплет шарэнгі сыходзяцца адзін супраць аднаго, на рэфрэн адыходзяць на сваё пачатковае месца. На другі куплет два ўдзельнікі, якія знаходзяцца з краю адной з шарэнгаў, падымаюць рукі, тым самым робячы «вароты». Удзельнік другой шарэнгі, які знаходзіцца з самага краю, не разрываючы рук, абыходзіць удзельнікаў карагоду са спіны і праходзіць праз «вароты» .<br>Усе гэтыя рухі паўтараюцца да канца песні.Рух - траісты крок. |
| Калядны карагод | Выконваўся падчас калядных святкаванняў. Па старым стылі з 24 снежня па 7 студзеня, па новым з 7 студзеня па 19 студзеня | У хаце, на вуліцы | Дзяўчаты і хлопцы | 1.Пад гарою цыган(**і**) стаялі, пад гарою цыган(**і**) стаялі ,<br><br>Стаяла думала цыганачка малада,<br>Стаяла думала цыганачка малада.<br><br>Поўны тэкст знаходзіцца ў архіве кафедры этналогіі і фальклору. | a-capella | Удзельнікі трымаюцца за рукі і рухаюцца па коле ў адзін бок. На 3 куплеце ў цэнтр кола выходзіць хлопец і рухаецца супраць руху карагоду. На 4 куплеце хлопец выбірае сабе дзяўчыну (цыганачку) і з ёй у пары рухаецца супраць руху кола. Так да канца песні. |
| Калядны карагод «Баяры» | У любы час | У хаце, на вуліцы | Дзяўчаты і хлопцы | 1.Баяры, а мы к вам прышлі, маладыя а чаго ж мы к вам прышлі<br><br>2. Баяры, а чаго ж вы к нам прышлі, маладыя а чаго ж вы к нам прышлі<br><br>3.Баяры, мы нявесту убіраць, маладыя мы нявесту убіраць | a-capella | Карагод складаецца з дзвюх шарэнгаў, якія ўтвараюць дзве паралельныя рысы. На першы куплет шарэнгі сыходзяцца адна супраць адной, а потым адыходзяць на сваё пачатковае месца да канца куплета. На 5 куплет, калі шарэнгі ізноў сыходзяцца, адна шарэнга «забірае» дзяўчыну з другой. Працэс гульні расцягваецца на ўсю песню. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 2016 годзе адбылася фальклорная экспедыцыя ў вёску Любонічы Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці, у якой прымалі ўдзел студэнты 103 групы кафедры этналогіі і фальклору УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

Падчас экспедыцыі фальклорны гурт «Страла» 103 групы пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка Шчадрынай Эвеліны Вячаславаўны, пазнаёміўся з фальклорным гуртом «Жывая спадчына», у складзе якога жыхаркі в. Любонічы і в. Сяргеевічы: Craнoвіч Мар'я Іванаўна (1939), Вішнеўская Аляксандра Сямёнаўна (1947), Craнoвіч Ніна Аляксандраўна (1936), Дрозд Вольга Сямёнаўна (1937), Шчоткіна Ніна Іванаўна (1946).

Матэрыял, які перанялі студэнты ў фальклорнага гурта «Жывая спадчына», багаты і разнастайны. Але больш за ўсё нашу ўвагу прыцягнула асаблівасць вёскі Любонічы – калядныя карагоды.



Малюнак 1 – Кола



Малюнак 2 – Шарэнга



Малюнак 3 - Змейка

Пры размове з носьбіткамі мы дазналіся, што ў в. Любонічы спяваліся і вадзіліся 4 калядныя карагоды. “Спявалі і вадзілі «Дубу», «Цыганачку», «Касароў», калі заходзілі ў хату на калядныя вячоркі. А пасля песень, напрыканцы, гулялі ў «Баяраў», – распавядала Салановіч Ніна Аляксандраўна.

Для поўнага аналізу ўсіх карагодаў я скарысталася абрадавай картай (табл. 1), якую распрацавала выкладчыца УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» Таццяна Аляксандраўна Пладунова. Абрадавая карта дапамагае цалкам раскрыць і прааналізаваць усе 4 карагоды ў в. Любонічы.



Малюнак 4 – Харэаграфічны малюнак каляднага карагода «Дуба»



Малюнак 5 – Харэаграфічны малюнак каляднага карагода «Касары»



Малюнак 6 – Харэаграфічны малюнак каляднага карагода «Цыганачка»

Карагоды «Дуба» (мал.4), «Касары» (мал.5), «Цыганачка» (мал.6) з’яўляюцца асаблівасцю традыцыйнай культуры в. Любонічы, а значыць і асаблівасцю традыцыйнай культуры Магілёўскага Падняпроўя. Карагод «Баяры» (мал.7) па характары выканання падобны да гульнёвага карагоду «Проса». Іх аб’ядноўвае аднолькавы харэаграфічны малюнак. Па выніку аналізу сведак, жыхарак вёскі Любонічы, гэтыя карагоды можна аднесці да карагодаў, прымеркаваных да каляднай абраднасці.




Малюнак 7 – Харэаграфічны малюнак каляднага карагода «Баяры»

Такім чынам, прааналізаваўшы 4 калядныя карагоды з в. Любонічы, можна зрабіць выснову, што гэтая традыцыйная з’ява ёсць адметнасцю Магілёўскага Падняпроўя, якая дапаўняе скарбонку асаблівасцей усёй магілёўскай карагоднасці.

**Спіс літаратуры:**

1. Хто,калі не я…: Да 60-годдзя Міколы Козенкі. Укл. В.В. Калацэй. – Мінск: выдавецтва “Чатыры чвэрці”, 2011. – 370 с. : іл..

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ